Н43

БИБЛИОТЕКА БГУ

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

13 чэрвеня 2008 года, № 11 (1983)

ДАСЯГНЕННІ

ПЕРАМОЖНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ трывала "прапісаўся" на Рэспубліканскай Дошцы пашаны: у пазамінулым годзе — на першым месце, летась — на другім, а сёлета — зноў на першым. Між іншым, найлепшая сярод навуковых арганізацый вызначаецца ўсяго толькі тры гады.

Па словах дырэктара НДІ ФХП доктара хімічных навук Алега Івашкевіча, гэта лідэрства заканамернае. Адной з галоўных прычын ён называе цесную сувязь з хімічным факультэтам БДУ і інтэграванасць у яго вучэбны працэс. Кожны трэці супрацоўнік інстытута ўдзельнічае ў навучанні студэнтаў, якія могуць выкарыстоўваць усю лабараторную базу НДІ. Такая сувязь навукі і адукацыі дазваляе ўмацоўваць інстытут добрымі кадрамі: ёсць магчымасць адбіраць і пакідаць у сябе найлепшых выпускнікоў хімфака. І як вынік – адпаведныя дасягненні вучоных.

Зараз даследаваннямі ў інстытуце займаюцца 12 дактароў і 75 кандыдатаў навук, усяго каля 180-ці чалавек. За апошнія дзесяць гадоў тут падрыхтавана 10 дактароў навук і 56 кандыдатаў – па сутнасці, патэнцыял яшчэ аднаго інстытута.

Навукоўцы НДІ ФХП вырашаюць вытворчыя пытанні самых розных галін – ад сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці да медыцыны і энергетыкі. "Хімія патрэбна ўсюды", – любіць паўтараць Алег Анатольевіч. Інстытут, які ён узначальвае, удзельнічае ў ажыццяўленні 13-ці навуковых і навукова-тэхнічных праграм і з'яўляецца галоўным выканаўцам дзяржаўных праграм "Лекавыя сродкі" і "Малатанажная хімія".

Асаблівае значэнне ў распрацоўках НДІ ФХП мае тэхналогія вытворчасці дызельнага біяпаліва з рапсавага алею, укаранёная на прадпрыемстве "Гродна Азот". Згаданае ноу-хау сёння вядомае на ўсю краіну і з'яўляецца своеасаблівай візітоўкай інстытута. Згодна з дзяржаўнай праграмай, прынятай у снежні, у рэспубліцы будуць паступова нарошчвацца аб'ёмы вытворчасці дызельнага біяпаліва да 110 тыс. т у 2010 годзе. А ўвесь аб'ём дызельнага нафтавага паліва, якое выкарыстоўваецца ў краіне (каля 2,2 млн т у год), будзе заменены на сумесевае паліва з 5-працэнтнай колькасцю метылавых эфіраў. Прычым якасць такога віду паліва праверана незалежнымі еўрапейскімі лабараторыямі і адпавядае замежным стандартам.

У інстытуце актыўна займаюцца і іншымі відамі паліва з сыравіны, якая ўзнаўляецца. Па даручэнні ўрада зараз фарміруецца нацыянальная праграма "Інавацыйныя біятэхналогіі", дзе ў раздзеле "Біяэнергетыка" НДІ ФХП, акрамя паліва з рапсавага масла, прызначанага для дызельных рухавікоў, будзе распрацоўваць паліва і для бензінавых рухавікоў (на аснове біябутанолу). Гэтыя даследаванні плануюць весці разам з Нацыянальнай акадэміяй навук і расійскімі вучонымі.

У мінулым годзе ў НДІ ФХП Белдзяржуніверсітэта агульны аб'ём фінансавання павялічыўся на 30 %, а фінансаванне з пазабюджэтных крыніц – у 1,5 разы. Пры гэтым у інстытуце рэалізуецца вельмі эфектыўны прынцып размеркавання фінансаў: сродкамі распараджаецца не кіраўніцтва, а самі навуковыя лабараторыі, і гэта для іх – магчымасць зарабіць на сваім інтэлекце. Чым не найлепшы стымул для крэатыўнай працы?

Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

МІЛАЯ СЭРЦУ ДРУГАЯ РАДЗІМА
Удзельнікі І Міжнароднага форуму замежных выпускнікоў беларускіх ВНУ дзеляцца сваімі думкамі.
Стар. 2

ГУЛЬНЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА...
Каманда супрацоўнікаў нашага універсітэта паспяхова выступіла на адмысловым турніры па футболе.
Стар. 3

"ЗБЯРЫ Ў АДНУ ЎСЮ БЕЛАРУСЬ СЯМ'Ю"
Студэнты БДУ зноўку святкавалі ў Вязынцы.
Стар. 4

ПАДЗЕЯ

МІЛАЯ СЭРЦУ ДРУГАЯ РАДЗІМА

Знамянальнай падзеяй для нашай краіны стала правядзенне 28—30 мая І Міжнароднага форуму замежных выпускнікоў беларускіх (савецкіх) ВНУ "Адукацыя без межаў".

Для ўдзелу ў згаданым мерапрыемстве па запрашэнні вышэйшых навучальных устаноў і Міністэрства адукацыі нашай краіны прыехалі каля 300 былых студэнтаў, а зараз дыпламатаў, чыноўнікаў, грамадскіх дзеячаў і прадпрымальнікаў з 110-ці дзяржаў.

Ідэя сустрэчы, падтрыманая Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, належыць Міжнароднай асацыяцыі выпускнікоў ВНУ. Яе сутнасць – у прыцягненні замежных грамадзян, якія раней тут навучаліся, да ўзаемакарыснага супрацоўніцтва ў эканоміцы, адукацыі, палітыцы і культуры.

На ўрачыстым адкрыцці форуму ў Палацы Рэспублікі віцэ-прэм'ер нашай краіны Аляксандр Косінец зачытаў пасланне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. У сваім выступленні Аляксандр Косінец таксама адзначыў, што з 1961 года беларускія ВНУ падрыхтавалі каля 30 тысяч замежных студэнтаў, і заўважыў, што прадастаўленне адукацыйных паслуг замежным грамадзянам у многіх краінах свету з'яўляецца адной з крыніц даходу і Беларусі неабходна павялічваць колькасць такіх студэнтаў. Паспрыяць гэтаму павінна дзяржаўная праграма развіцця адукацыі, праект якой нядаўна падрыхтаваны. Яна прадугледжвае ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы айчынных ВНУ, а таксама будаўніцтва некалькіх дзесяткаў студэнцкіх інтэрнатаў да 2015 года, што вырашыць праблему забеспячэння жыллём замежных студэнтаў. Акрамя таго, будзе створаны банк даных аб замежных выпускніках беларускіх ВНУ для ўмацавання эфектыўнасці адукацыйнай сістэмы, інвестыцый і развіцця сумеснага бізнэсу.

Удзельнікі міжнароднага форуму разам з прадстаўнікамі нашага універсітэта.

Прарэктар БДУ прафесар Віктар Самахвал атрымоўвае сувеніры ад былых в'етнамскіх выпускнікоў.

У сваю чаргу многія выступоўцы з ліку замежных гасцей адзначалі, што беларуская вышэйшая школа была найлепшай у Савецкім Саюзе, а сёння яна – найлепшая ў СНД. Айчынная адукацыя мае высокую якасць і адначасова даступная па кошце. У нас шырокі спектр адукацыйных паслуг, магутны інтэлектуальны рэсурс, высокі навукова-педагагічны патэнцыял і стабільная сітуацыя ў краіне. Нярэдкія выпадкі, калі студэнты прыязджаюць спачатку ў Расію, а потым вырашаюць вучыцца ў Беларусі. Гэтыя перавагі трэба выкарыстоўваць, каб прыцягнуць больш іншаземцаў на вучобу ў нашую краіну. Абмеркаванне праблематыкі форуму было працягнута на секцыйных пасяджэннях, якія прайшлі ў буйнейшых ВНУ краіны, а таксама ў РІВШ.

У Белдзяржуніверсітэце працавала секцыя "Адукацыйныя паслугі беларускіх устаноў адукацыі для замежных грамадзян", урачыста адкрытая рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым. У дыскусіі, апрача замежных гасцей, бралі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі і замежных спраў нашай краіны, Дэпартамента грамадзянства і міграцыі, кіраўнікі структурных падраздзяленняў БДУ і навучальных кафедраў, а таксама ўпраўлення міжнародных сувязяў. Па заканчэнні была прынята рэзалюцыя, у якой, у прыватнасці, выказаны прапановы па ўдасканаленні маркетынгавай стратэгіі экспарту адукацыйных паслуг з улікам выгаднай кан'юнктуры, якая склалася на сёння для Беларусі.

У рамках форуму адбыліся таксама бізнэс-сустрэчы, на якіх абмяркоўваліся магчымасці заключэння дамоваў паміж беларускімі арганізацыямі і замежнымі дзяржаўнымі і прыватнымі структурамі па канкрэтных праектах. Акрамя таго, "нашы" замежнікі наведалі выставу дасягненняў беларускай эканомікі і адукацыйных паслуг, а таксама турысцкія аб'екты і шэраг вядучых прадпрыемстваў Мінска.

Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА
(Працяг тэмы на стар. 2.)

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

МІЛАЯ СЭРЦУ ДРУГАЯ РАДЗІМА

І Міжнародны форум замежных выпускнікоў ВНУ сабраў мноства найцікавейшых людзей, выбітных асоб, якім ёсць пра што расказаць і чым падзяліцца. Двух з паловай дзён хапіла гасцям, каб знайсці агульную мову і завязаць трывалае знаёмства са сваімі калегамі. На форуме лунаў дух карпаратыўнай еднасці, замешаны на настальгічных успамінах студэнцкай маладосці. Усе былі вельмі рады зноў апынуцца на сваёй другой радзіме і жадалі больш цесных кантактаў з ёю. Мы пагутарылі з найбольш адметнымі ўдзельнікамі мерапрыемства.

МІЖКУЛЬТУРНЫ ДЫЯЛОГ

Доктар гістарычных навук Баляслаў ХМЯЛІНСКІ, старшыня таварыства "Польшча – Беларусь" надзвычай задаволены арганізацыяй і праграмай мерапрыемства. Нядаўна ён закончыў дактарантуру БДУ, а з нашай ВНУ супрацоўнічае ўжо больш як 15 гадоў з моманту стварэння вышэйназванай суполкі:

– Нас тут сустрэлі вельмі гасцінна. А сам форум атрымаўся даволі інфарматыўным, кожны мог задаволіць сваю цікаўнасць. Так лічаць і мае калегі. Я ўжо сустрэў пяць землякоў, з якімі дамовіўся пабачыцца ў Варшаве і пашырыць кола знаёмстваў. Дарэчы, сёлета ў Польшчы распачала сваю дзейнасць Асацыяцыя выпускнікоў ВНУ Савецкага Саюза на чале з былым генконсулам у Ленінградзе Баляславам Капітанам. Правесці гэткі форум – цудоўная ініцыятыва. Паміж удзельнікамі з многіх краін завязаліся цесныя стасункі. І афрыканцы, і лацінаамерыканцы, і в'етнамцы – усе добра размаўляюць па-руску. Нават тыя, хто закончыў ВНУ 15–20 гадоў таму, а то і болей.

– Міжнародны дыялог – сфера Вашых прафесійных інтарэсаў, і звязаны яны менавіта з нашай краінай. Чым займаецца таварыства "Польшча – Беларусь"?

– Найперш – гэта чалавечыя стасункі. Разам з іншымі навучальнымі ўстановамі мы падрыхтавалі 22 навуковыя канферэнцыі гісторыкаў у Польшчы, Гродна, Мінску, Брэсце... Ніводная акадэмія, ніводзін універсітэт гэтага не зробіць. Вось, напрыклад, зараз у Акадэміі Падляскай у Седльцах (100 км ад Брэста) таксама праходзіць канферэнцыя навукоўцаў дзвюх краін на тэму "Беларуска-польскія адносіны ў мінулым, сёння і ў будучыні", адным з арганізатараў якой з'яўляецца прафесар БДУ Эдуард Снапкоўскі. Прычым, як вам вядома, у нас, у Польшчы, гаварыць пра сяброўства з Беларуссю не так і проста. Але гэта на афіцыйным узроўні, а адносіны паміж людзьмі, пра што я пісаў у сваіх кнігах, – добрыя, сяброўскія і проста людскія. Бо ў нас жа з вамі шматгадовая агульная гісторыя. Паміж намі не было войнаў...

Поўнае ўзаемапаразуменне і падтрымку мы знаходзім у вашага пасла Паўла Латушкі. Гэта вельмі энергічны і адукаваны дыпламат. Пры яго садзейнічанні мы штомесяц прымаем нашых беларускіх сяброў-навукоўцаў, а таксама вашыя творчыя калектывы. У нас гастралявалі "Пухаўчанка", "Купалінка" і "Чысты голас". Неўзабаве ў Варшаву прыедзе самабытны ансамбль акардыяністаў з Мінска...

– Напэўна, не засталася па-за Вашай увагай і сфера адукацыі?

– Так. Важным складнікам нашай працы з'яўляецца арганізацыя алімпіяды па беларускай мове ў Польшчы. Такая не праводзіцца нідзе ў свеце. Сёлета яна адбудзецца ўжо ў 14-ы раз, і ўсе яны ладзяцца на базе кафедры беларусістыкі Варшаўскага універсітэта. Дарэчы, беларуская мова ўключана ў вучэбныя праграмы дзвюх сярэдніх школ у Гайнаўцы і Бельску-Падляскім (Падляскае ваяводства). Варта адзначыць, што пераможцы нашай алімпіяды атрымліваюць права на залічэнне ў беларускія і польскія ВНУ без іспытаў. За апошні час каля 500 яе фіналістаў скарысталіся гэтай магчымасцю.

Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы алімпіяды нам аказвае філфак БДУ і асабіста дацэнт Уладзімір Навумовіч. Нашыя лаўрэаты штогод прыязджаюць на экскурсію ў Мінск, у БДУ. Для іх арганізуюцца сустрэчы і пражыванне ў інтэрнаце. Мы са свайго боку таксама кожны год прымаем на адпачынак у Польшчы беларускіх дзяцей. Паказваем ім Варшаву, Кракаў, Гданьск, дзе навучэнцы знаёмяцца са сваімі аднагодкамі, з якімі падтрымліваюць кантакты і надалей.

Яшчэ адзін важны аспект. Разам з беларускім пасольствам мы дапамагаем супрацоўніцтву гарадоў-пабрацімаў, якія маюць дамовы паміж сабой. Такіх сёння больш за 50: Семятычы – Паставы, Горкі – Габолін, Бяла-Падляска – Брэст, Зялёна-Гура – Віцебск... Да слова, калі памятаеце, у Зялёнай-Гуры праходзіў Фестываль савецкай песні, а ў Віцебску гэтая традыцыя працягнулася ў "Славянскім базары". Сёлета пасля візіту нашага прэм'ера Туска ў Маскву вырашана аднавіць фестываль песні славянскіх народаў. З задавальненнем будзем чакаць вашых артыстаў.

КААРДЫНАЦЫЯ АБМЕНАЎ

За шматгадовае плённае супрацоўніцтва з БДУ прафесар з Магдэбурга Эберхард ГІРЛІХ атрымаў ганаровае званне доктара нашага універсітэта. І падчас форуму ён скарыстаўся магчымасцю сустрэцца з калегамі на кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў мехмата. Тут мы яго і "злавілі"...

– Гер Гірліх, якім чынам лёс звязаў Вас з БДУ і як працякае кааперацыя з беларускімі калегамі?

– Упершыню я прыехаў у БДУ ў 1975 годзе, калі паступаў у аспірантуру да прафесара Уладзіміра Ямелічава. З 1990 года каардыную працу паміж групамі навукоўцаў Магдэбургскага універсітэта і БДУ, чым удалося зацікавіць даследчыкаў з мехмата, ФПМІ і эканамічнага факультэта.

З маім сённяшнім партнёрам прафесарам Міхаілам Кавалёвым мы таксама вядзём навуковую працу ў галіне дыскрэтнай аптымізацыі. У апошні час заняліся яе эканамічным аспектам, так званай партфельнай тэорыяй, звязанай з аптымізацыяй фінансавых актываў.

У 2005 годзе паміж нашымі універсітэтамі падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве, і яно займела трывалую аснову. Дапамогу ў ажыццяўленні навуковых і студэнцкіх абменаў аказвае DAAD (Нямецкая акадэмічная служба абменаў. – *Рэд.*) у рамках праграмы "Усходняе партнёрства".

– Наколькі вядома, абмен нашымі студэнтамі выходзіць за рамкі азнаямленчых візітаў...

– Сапраўды, паўнавартаснаму навучанню спрыяе тое, што дзякуючы праекту TEMPUS у БДУ і Магдэбургу адкрыта спецыяльнасць "Кампутарная матэматыка" з адзінымі вучэбнымі планамі. Гэта дае магчымасць як нямецкім, так і беларускім студэнтам наведваць у партнёрскіх ВНУ аналагічныя дысцыпліны з далейшым прызнаннем вучэбных вынікаў у родным універсітэце. Прычым выкладчыкі кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў у БДУ чытаюць лекцыі па-нямецку. У гэтай справе ім дапамагаю я з маімі нямецкімі калегамі, якія таксама прыязджаюць у Мінск (сярод іх і дэкан матэматычнага факультэта Універсітэта Магдэбурга прафесар Вольфган Вілемс).

Таму, акрамя засваення сваёй спецыяльнасці, студэнты могуць вывучыць і нямецкую мову, што дае ім магчымасць уладкавацца на працу ў нямецкія фірмы тут, у Беларусі, ці працягваць навучанне ў Германіі. Напрыклад, адзін з нямецкіх удзельнікаў форуму, прадстаўнік сумеснага прадпрыемства ў Баранавічах, захацеў запрасіць на працу нашага выпускніка. Апрача таго, канкрэтны інтарэс праяўляюць і ў клубе нямецкай прамысловасці. А яшчэ такі выпадак: наша былая студэнтка Вольга Абрамава закончыла аспірантуру ў Магдэбургу і зараз працуе дацэнтам на кафедры ў БДУ. Яшчэ два студэнты таксама вучацца ў Германіі, а для двух іншых рыхтуюцца стыпендыі.

Нашы прафесары вельмі падтрымліваюць гэтую праграму, таму што тыя, хто прыязджалі, заўсёды былі сярод найлепшых студэнтаў на курсе.

Што да нямецкай моладзі, то за апошнія два гады ў БДУ пабывалі 14 чалавек. Адна з дзяўчат працавала тут тры месяцы, на працягу якіх вучылася, праводзіла заняткі і практыкавалася ў мясцовай фірме. Сёлета DAAD будзе яшчэ вызначацца з квотай, я ж фармірую групу беларускіх студэнтаў для вучобы на адзін семестр у Германіі.

– Калі ласка, некалькі слоў пра мінскі форум...

– Я дужа задаволены. Паглядзеў горад, паслухаў канцэрт. Раней на гэта не ставала часу. Шкадую, што дадзенае мерапрыемства не змаглі наведаць іншыя выпускнікі БДУ, з якімі калісьці вучыліся разам. Такая форма стасункаў вельмі важная і можа быць даволі эфектыўнай. Як заўважыў адзін з замежных гасцей, калі падобныя сустрэчы стануць рэгулярнымі, то можна арганізаваць збор сродкаў сярод выпускнікоў пад якінебудзь праект. І гэта нармальная практыка. Бо для ўсіх удзельнікаў Беларусь – другая радзіма, і яны імкнуцца да аднаўлення кантактаў з ёю. У ЗША такая сістэма вельмі распаўсюджаная. У Германіі той жа DAAD падтрымлівае аналагічныя асацыяцыі пры універсітэтах, якія называюцца Алюмні. А 7 ліпеня ў Мінску адбудзецца сустрэча стыпендыятаў розных праграм гэтай арганізацыі.

Я сам стаўлюся да Беларусі вельмі цёпла. 50 разоў ужо бываў тут і кожны раз прыязджаю з задавальненнем.

КУБІНСКІ СТАРАЖЫЛ

Напэўна, самыя "каларытныя" замежнікі з тых, хто некалі навучаўся ў БДУ, – прадстаўнікі вострава Свабоды. Экстравагантныя кубінцы заўсёды знаходзяцца ў цэнтры ўвагі і становяцца душой любой кампаніі. Такім я пабачыў Арланда РЭЙНОСА ў холе гасцініцы "Беларусь", куды былі кватараваныя ўдзельнікі форуму. Гэты чалавек сабраў вакол сваёй імправізаванай экспазіцыі натоўп прыхільнікаў і проста разявак. І не дзіўна, бо змайстраваны ім з двух часопісных столікаў, накрытых нацыянальным сцягам, прэзентабельны стэнд з кідкай буклетнай інфармацыяй даў бы фору некаторым выставачным аналагам. Мяне ж скіравала да яго не пустая цікаўнасць, а той факт, што камрад Рэйноса паходзіць з плеяды першых замежных студэнтаў, якія масава паступілі да нас на вучобу ў 1962 годзе.

"Мяне запрасілі, таму што я вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце, – з ходу заявіў госць. – Я адзін з першыў кубінцаў, якія прыехалі сюды. Закончыў падрыхтоўчы факультэт (сённяшні ФДА. – *Рэд.*), дзе мяне навучылі гаварыць і пісаць па-руску. А праз год паступіў на хімічны факультэт, які закончыў у 1967 годзе. Потым вярнуўся на Кубу. Працаваў там гадоў 15 і абараніў доктарскую дысертацыю, таксама па хімічных навуках, – выклаў сваё "сіві" гаманлівы кубінец.

– Аб чым Ваша экспазіцыя?

– Я шмат гадоў працую ў Цэнтральным навуковым цэнтры Кубы, які размешчаны ў сталічнай Гаване ў спецыяльным даследчым гарадку кшталту таго, што быў калісьці ў Сібіры. Тут ёсць інфармацыя пра распрацоўкі навукоўцаў нашага цэнтра (*паказвае на буклеты*). Гэта прылады для дыягностыкі і сродкі для лячэння розных захворванняў... Акрамя таго, вось дыск з фільмам, прысвечаным 50-годдзю амерыканскай блакады Кубы, дзе распавядаецца пра эканамічныя страты і палітычныя падкопы ўрада ЗША... *(Пасля кароткага экскурсу ў гісторыю супярэчлівых адносін дзвюх краін-суперніц ён усклікае: "Але мы не здаёмся – і пераможам!").*

– Раскажыце падрабязней пра Вашу навуковую дзейнасць.

– У навуцы я ўжо 41 год. У ЦНЦ займаюся пошукамі ў галіне медыцыны, звязанымі з арганічнай хіміяй. Мая праца з'яўляецца працягам той тэмы, якой з 1983 па 1991 гг. займаўся міжнародны кансорцыум навукоўцаў з СЭУ (Савет эканамічнай узаемадапамогі. – *Рэд.*) – прадстаўнікоў так званага сацлагера. Я быў вучоным сакратаром і перакладчыкам з рускай мовы, якая тады была асноўным сродкам зносін. Тэмай даследавання сталі "паводзіны" такіх матэрыялаў, як тканіна, скура, гума, пластмасы і г.д. у вільготным трапічным клімаце. Там ёсць вельмі моцныя фактары, якія садзейнічаюць паскарэнню працэсаў старэння ў параўнанні з кантынентальным кліматам: канцэнтрацыя азону, высокая тэмпература, вільготнасць і інш. Спецыфічныя кліматычныя ўмовы ўздзейнічаюць і на самога чалавека. Пад уплывам ультрафіялетавай радыяцыі арганізм зношваецца хутчэй. Ёсць і іншыя фактары. Трэба было знайсці сродак для таго, каб затармазіць гэтыя працэсы.

– Гэта Вам удалося, калі глядзець на Вашу выдатную фізічную форму...

– *...(Смяецца.)*

– Каго з выкладчыкаў узгадваеце найперш і ці бывалі з тых часоў на другой радзіме?

– Выкладчык з падрыхтоўчага факультэта Таццяна Лаўрэнцьеўна навучыла мяне думаць на рускай мове. Гавару па-руску, як быццам гэта мая родная мова. Па-англійску магу гаварыць і па-венгерску таксама, але значна горш. Ну і, канешне ж, прыгадваю свайго кіраўніка дыплома – знакамітага хіміка Леаніда Станішэўскага, прафесара хімфака БДУ, з якім збіраюся сустрэцца. Дысертацыю я, дарэчы, пісаў у Маскве ў Інстытуце хімічнай фізікі. А потым прыязджаў у Беларусь кожныя 10 гадоў. Апошні раз быў 20 гадоў таму.

– Ці падтрымліваеце сувязь са сваімі сакурснікамі?

– Перад самым ад'ездам адзін з іх быў у мяне ў гасцях. Калі прыляцеў у Маскву – пабачыўся яшчэ з адным. Адносіны ў нас добрыя. Дзякуючы інтэрнэту падтрымліваць сувязь стала прасцей.

Усяго ж нас было 63 чалавекі. Некаторых ужо няма... Самі разумееце – час. Памятаю, што з нашай групы многія паступілі ў Політэхнічны інстытут, некаторыя – на фізфак БДУ, а пяць чалавек, сярод якіх і ваш пакорны слуга – на хімфак. У мяне дагэтуль захоўваюцца агульныя фотаздымкі.

З гэтымі словамі Арланда Рэйноса адкрыў чамадан і дастаў сапраўдны рарытэт – дыплом, выдадзены яму ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў 1967 годзе. І звярнуў увагу на падораны да гэтай падзеі значок, які з гонарам носіць на сваім пінжаку.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Сяргей ШАФАЛОВІЧ

ВІНШУЕМ!

З НАВУКОВЫМ ІМПЭТАМ

У Белдзяржуніверсітэце з 13 па 16 мая прайшла 65-я Навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў.

Прарэктар Уладзімір Панькоў ганаруе пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў ВНУ.

Яна стала адной з найбольш маштабных па колькасці ўдзельнікаў, заяўленых дакладаў, а таксама факультэтаў і адукацыйных устаноў БДУ, на якіх праходзілі секцыі. Сёлета ў рабоце 162-х секцый канферэнцыі ўдзельнічалі 2697 студэнтаў і аспірантаў БДУ (летась – 140 секцый і 2151 удзельнік), было зроблена 2620 дакладаў (летась – 1999). Такім чынам, год ад году ўсё больш студэнтаў БДУ далучаецца да навуковых даследаванняў, і першая іх апрабацыя даволі часта адбываецца на дадзеным мерапрыемстве.

У рамках канферэнцыі 15 мая ў зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ прайшло вынікovае мерапрыемства. На ім з прамовай выступіў прарэктар па навуковай рабоце БДУ прафесар Уладзімір Панькоў. Ён звярнуў увагу на тое, што сённяшнім студэнтам, якія збіраюцца звязаць свой далейшы лёс з навукай і стаць сучаснымі вучонымі, неабходна больш актыўна шукаць навуковых партнёраў для сумесных даследаванняў як у Беларусі, так і за яе межамі. Кіраўніцтва універсітэта са свайго боку будзе вырашаць пытанні фінансавання такіх праектаў.

Падчас пленарнага пасяджэння была праведзена цырымонія ўзнагароджання дыпломамі навучэнцаў БДУ, адзначаных на Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў за 2007 год. Шэсць нашых маладых даследчыкаў сталі лаўрэатамі конкурсу, а працы яшчэ 30-ці студэнтаў аднесены да І катэгорыі.

Перад удзельнікамі пасяджэння выступілі з дакладамі адзін з пераможцаў сёлетняга конкурсу Уладзімір Нічыпаровіч (ФФСН, V курс) і навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Дзмітрый Харошка.

Віталь КУТАВІЧУС,
начальнік аддзела НДРС
НДЧ-ГУН БДУ

КАНФЕРЭНЦЫІ

Першая Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Гістарыяграфія як аб'ект пазнання" праведзена 21 мая гістарычным факультэтам пры ўдзеле Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута.

ЕЎРОПА – НАШ АГУЛЬНЫ ДОМ

Навукоўцы з Беларусі, Францыі, Расіі і Фінляндыі падчас сустрэчы абмеркавалі сучасныя працэсы гістарычнага самапазнання і іх адлюстраванне ў гістарыяграфіі, суаднесенасць агульнанавуковых метадаў і метадаў спецыяльных гістарычных дысцыплін, метадалогіі гістарычнага даследавання і методыкі навучання гісторыі, новых падыходаў і метадаў даследавання.

Канферэнцыя стала выніковай часткай праекта "Гістарычная свядомасць у кантэксце культурнага памежжа, ці Дзе знаходзіцца цэнтр Еўропы", які праводзіўся ў 2006–2008 гг. пры фінансаванні Беларускага фонду фундаментальных даследаванняў. У 2007 г. дадзены праект быў падтрыманы французскім фондам "Дом навук аб чалавеку" (Fondation de la Maison des Sciences d'Homme, Paris), створаным ў 1963 г. пры Міністэрстве вышэйшай адукацыі і даследаванняў Францыі. Ён выконвае ролю каардынатара ў развіцці міждысцыплінарнага, міжінстытуцыйнага і міжнароднага супрацоўніцтва.

Французскія навукоўцы, якія бралі ўдзел у праекце, прадстаўлялі ў асноўным Вышэйшую школу сацыяльных даследаванняў – адну з найбольш прэстыжных ВНУ Францыі. Удзельнік канферэнцыі Алан Блум з'яўляецца дырэктарам Цэнтра даследаванняў Расіі, Каўказа і Цэнтральнай Еўропы (CERCEC), заснаванага ў красавіку 1995 г. з мэтай вывучэння гісторыі гэтых рэгіёнаў з акцэнтам на міждысцыплінарных падыходах.

Дзмітрый ЖАРЫН

КОНКУРСЫ

ЧЫМ МНЕ ДАРАГІ МОЙ ХРАМ?

Вынікі Рэспубліканскага конкурсу рэфератаў і сачыненняў навучэнцаў школ, прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў "Жыццё і адказнасць за тварэнне" падведзены 29 мая ў Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ.

На конкурс было даслана 57 работ. Аўтары 9-ці найлепшых сачыненняў атрымалі дыпломы. Па добрай традыцыі пасля ўрачыстасцяў падлеткаў чакала паездка ў Жыровіцкі манастыр.

Конкурс праводзіўся трэці раз з мэтай звярнуць увагу моладзі на маральныя праблемы. Яго тэматыка: «Мэта і сэнс жыцця ў хрысціянскім разуменні»; «Хрысціянскія адносіны да Бога, людзей, сябе і свету»; «Нагорная пропаведзь Хрыста як аснова хрысціянскай маральнасці»; «Ці з'яўляюцца хрысціянскія каштоўнасці жыццёвым арыенцірам для сучаснай моладзі?» і «Чым мне дарагі мой храм?».

Лейла ІСМАІЛАВА

АБ'ЯВА

ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ!

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на другое паўгоддзе 2008 года.

Падпісны кошт на часопіс "Веснік БДУ" па серыях:

Серыя І. Фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 3, верасень):

індывідуальная (індэкс 74851) – 11 170 р. (Белпошта); 10 350 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748512) – 32 665 р. (Белпошта); 30 545 р. (Белсаюздрук).

Серыя ІІ. Хімія, біялогія, геаграфія (№ 3, кастрычнік):

індывідуальная (індэкс 74852) – 11 170 р. (Белпошта); 10 350 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748522) – 32 665 р. (Белпошта); 30 545 р. (Белсаюздрук).

Серыя ІІІ. Гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2, ліпень; № 3, лістапад):

індывідуальная (індэкс 74853) – 22 350 р. (Белпошта); 20 710 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748532) – 65 330 р. (Белпошта); 61 089 р. (Белсаюздрук).

Серыя ІV. Філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 2, жнівень; № 3, снежань):

індывідуальная (індэкс 74854) – 22 350 р. (Белпошта); 20 710 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748542) – 65 330 р. (Белпошта); 61 089 р. (Белсаюздрук).

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі, крамах і кіёсках Белсаюздруку Рэспублікі Беларусь.

Часопіс "Веснік БДУ" ўсіх чатырох серый можна набыць у кіёску галоўнага корпуса БДУ (прасп. Незалежнасці, 4); серыю ІV – у кіёску "Універсітэцкая кніга" (вул. Ленінградская, 8).

Найбольш танны і надзейны спосаб атрымання часопіса – гэта ПАДПІСКА!

ВЕДАЙ НАШЫХ!

8 ПЕРШЫХ МЕСЦАЎ – У БДУ!

18–20 мая на базе БДУ прайшла Рэспубліканская студэнцкая алімпіяда па матэматыцы.

У інтэлектуальных спаборніцтвах удзельнічалі 26 каманд з 25-ці ВНУ краіны (усяго – 107 студэнтаў). Традыцыйна ўсе яны разбіваюцца на дзве групы: група А (класічныя і педагагічныя універсітэты) і група Б (тэхнічныя і іншыя ВНУ).

Найбольш прадстаўнічай была каманда БДУ – 13 чалавек з факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і механіка-матэматычнага факультэта. Амаль усе яны атрымалі ўзнагароды: 4 дыпломы І ступені, 3 – ІІ ступені, 4 – ІІІ ступені і адзін ухвальны водгук. Пры гэтым першыя 8 месцаў заваявалі нашыя студэнты. Яшчэ 2 дыпломы ІІІ ступені ўзялі навучэнцы Віцебскага дзяржаўнага універсітэта.

Сярод удзельнікаў групы Б найбольш паспяховым было выступленне студэнтаў БДУІР (2 дыпломы І ступені і 3 дыпломы ІІІ ступені).

У канцы ліпеня адбудзецца Міжнародная студэнцкая алімпіяда па матэматыцы ў Балгарыі. Напярэдзе два месяцы сур'ёзнай падрыхтоўкі. Нагадаем, што ўжо двойчы, пачынаючы з 2000 года, каманда БДУ прызнавалася найлепшай сярод усіх універсітэтаў, якія ўдзельнічалі ў гэтых прэстыжных спаборніцтвах. Пажадаем нашым матэматыкам дасягнуць вялікіх поспехаў і сёлета.

Аляксандр КАРПОВІЧ

СПОРТПЛЯЦОЎКА

ГУЛЬНЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА...

Напрыканцы мая прайшоў Першы Рэспубліканскі турнір па футболе "для тых, каму за сорак" сярод каманд вытворчых калектываў прадпрыемстваў і арганізацый на прызы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму нашай краіны, а таксама Беларускай федэрацыі футбола.

Каманда супрацоўнікаў БДУ – срэбны прызёр спаборніцтваў.

Футбол прынята лічыць гульнёй маладых. Нават у прафесійных спартоўцаў пасля 30-ці гадоў гульнёвая кар'ера пачынае заканчвацца. У аматараў – свае абмежаванні. У дзяцінстве можна было дні навылёт ганяць мяч, але потым навальваюцца клопаты – вучоба, праца, сям'я. Камусьці яшчэ, праўда, можа пашэнціць пагуляць у футбол, абараняючы гонар прадпрыемства на прафсаюзнай спартакіядзе. Але размяняў чалавек пяты дзесятак – і ўсё: час вешаць буцы на цвік і пераходзіць да менш актыўных відаў спорту – шашак, гарадкоў ці дартса. Аднак нездарма футбол называюць улюбёнай гульнёй мільёнаў. Калі чалавек пастаянна падтрымлівае сябе ў добрай фізічнай форме, хто яму будзе ў пашпарт зазіраць? Была б толькі магчымасць – гуляй сабе на задавальненне.

Як аказалася, у нашай навучальнай установе шмат такіх энтузіястаў, якіх аб'яднаў прафкам супрацоўнікаў БДУ. Менавіта каманда нашай ВНУ на гэтым турніры "адсопвалася" за ўсю сістэму вышэйшай адукацыі... і выступіла з годнасцю. Атрымаўшы тры перамогі і заняўшы І месца ў сваёй групе (усяго іх было тры па чатыры каманды кожная), нашыя спартоўцы выйшлі ў паўфінал, дзе сустрэліся з камандай ААА "Магілёўхімвалакно". Барацьба атрымалася сапраўды ўпартай: асноўны час матча закончыўся "нічыёй" (2:2), а ў серыі адзінаццаціметровых удараў удача ўсміхнулася нашым. У фінале іх чакала гульня з камандай РУП "Гомсельмаш". І тут два таймы закончыліся таксама нічыйным вынікам (1:1, гол у адказ правёў Уладзімір Панарадаў). На жаль, гэтым разам "па пенальці" мы саступілі і задаволіліся "срэбрам" турніру. Калектыў БДУ да спаборніцтваў рыхтаваў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі (РЦАП) па футболе Уладзімір Пігулеўскі, ён жа быў гуляючым трэнерам і капітанам каманды.

Спаборніцтвы праходзілі на штучным полі РЦАП БДУ па вул. Сямашка, а таксама на спартыўнай базе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі "Алімпіец" на Мінскім моры.

Сяргей ГАЎРЫЦКІ

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Пра спецыяльнасць "Эканамічная кібернетыка" на ФПМІ БДУ – **"Настаўніцкая газета" ("Сімбіёз матэматычнай і эканамічнай навук", 07.06).**

Вынікі конкурсу "Жыццё і адказнасць за тварэнне" Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ – **"Настаўніцкая газета" ("Моладзь, якая гатова абараняваць уласнымі інтарэсамі", 07.06).**

Першая Міжнародная канферэнцыя "Беларуска-яўрэйскі дыялог" – **"СБ – Беларусь сегодня" ("Сверяя исторический опыт...", 05.06).**

Студэнты БДУ – пераможцы ІІІ Міжнароднай юрыдычнай студэнцкай алімпіяды сярод рускамоўных груп – **"Рэспубліка" ("Победители по праву", 03.06).**

Інтэрв'ю з кандыдатам біялагічных навук, дацэнтам біяфака БДУ, старшынёй журы секцыі "Біялогія" Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі школьнікаў, чальцом аргкамітэта Рэспубліканскай алімпіяды па біялогіі Дзмітрыем Сандаковым – **"Настаўніцкая газета" ("Работа думкі і пошук цікавай ідэі", 31.05).**

Праца са студэнтамі-замежнікамі ў Інстытуце бесперапыннай адукацыі БДУ – **"Знамя юности" ("Учись, студент!", 30.05).**

Міністр абароны наведаў ваенны факультэт БДУ – **"Во славу Родины" ("С акцентом на новые методики", 30.05).**

Распрацоўкі НДІ ФХП БДУ – аднаго з пераможцаў у спаборніцтве за дасягненне ў 2007 годзе найлепшых вынікаў у выкананні асноўных мэтавых паказальнікаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь – **"Рэспубліка" ("Карманный завод институту не в тягость", 29.05); "Настаўніцкая газета" ("Трэці год запар на Рэспубліканскай Дошцы гонару", 29.05); "Звязда" ("Першы айчынны прэпарат супраць ВІЧ/СНІДу ствараецца ў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ", 30.05).**

Вынікі прыёмнай кампаніі ў Ліцэй БДУ – **БелТА (20.05); "Звязда" ("На вяршыні рэйтынгу ў ліцэістаў – эканоміка", 23.05); "Народная газета" ("Знания от природы", 30.05).**

Рэалізацыя праекта Дзіцячага фонду ААН "Стварэнне мадэлі фарміравання ўсвядомленага бацькоўства" Цэнтрам перспектыўнага дзяцінства пры БДУ – **"Настаўніцкая газета" ("У Беларускім дзяржаўным універсітэце будуць вучыць... быць бацькамі", 24.05).**

Сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў філфака БДУ з таленавітымі настаўнікамі нашай краіны – **"Настаўніцкая газета" ("Лепшая агітацыя – сустрэча з прафесіяналамі", 24.05).**

Студэнты БДУ – удзельнікі Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу мастацкай творчасці студэнтаў "Арт-вакацыя" – **"Знамя юности" ("Самый зрелищный экзамен", 23.05).**

Вынікі конкурсу на найлепшы пераклад сучаснай французскай і іспанскай прозы сярод студэнтаў БДУ – **"Рэспубліка" ("Иностранный – как родной", 23.05).**

XIV Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні – **БелТА (22.05); "Звязда" ("Пазнаць свет і чалавека", 23.05); "ЛіМ" ("У пазнанні чалавека і свету", 23.05).**

Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Універсітэтам Пратопы – **БелТА (19.05); БелаПАН (21.05).**

Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ

13 чэрвеня 2008 года, № 11 (1983)

СВЯТКАВАННІ

КУПАЛАВЫМ СЛОВАМ СПАВІТЫЯ

Вязынка – маляўнічы куток Міншчыны, які займае сваё адметнае месца ў жыцці і творчасці Янкі Купалы. Сёння кожнаму беларусу вядомыя гэтыя славутыя мясціны, дзе ў 1882 годзе нарадзіўся паэт. Менавіта тут па даўняй традыцыі філалагічны факультэт БДУ штогод праводзіць патрыятычна-асветніцкія акцыі ў гонар славутага беларускага паэта.

Сёлетняе мерапрыемства было прымеркавана да 100-годдзя з дня выдання "Жалейкі" – першага зборніка Янкі Купалы. Да святкавання 17 мая далучыліся прадстаўнікі ўсіх факультэтаў БДУ. Прыемна, што моладзь не страціла цікавасці да нацыянальнай спадчыны і ахвотна прыязджае на радзіму Песняра.

Урачыстая частка мерапрыемства побач з сядзібай-музеем Янкі Купалы распачалася гімнамі "Магутны Божа" і "Гаўдэамус", якія віртуозна выканалі студэнты капэлы Інстытута тэалогіі БДУ. На святой купалаўскай зямлі прысутных віталі дэкан філалагічнага факультэта прафесар Іван Роўда, вучоны сакратар музея Алена Бурбоўская, старшыня Міжнароднага фонду імя Янкі Купалы і вядомы купалазнаўца прафесар Вячаслаў Рагойша. Пасля чыталіся вершы з першага зборніка Купалы, гучалі народныя песні ў выкананні фальклорна-этнаграфічнага гурта "Багач", не абышлося і без танцаў. Усё гэта напоўніла наваколле хараством і прыгажосцю, злілося ў агульны гімн вялікаму паэту і яго непаўторнаму таленту.

Хутка распачалася спартыўна-забаўляльная частка на Парнасе – маляўнічым узгорку, дзе адкрываюцца цудоўныя краявіды. Студэнты, падсілкаваўшыся кашай "ад дэкана", паспрабавалі свае сілы ў розных спаборніцтвах, сярод якіх найбольшую папулярнасць меў конкурс "Пенальці дэкану". Іван Сямёнавіч у каторы раз даказаў сваю варатарскую вартасць, адбіўшы больш за 50 удараў. Займальным было і спартыўнае арыентаванне, дзе перамагла каманда "Мехмацяты" з адпаведнага факультэта.

Ідучы насустрач "сардэчным" памкненням студэнтаў, на Парнасе дзейнічаў так званы "ЗАГС". Таму ў гэты знамянальны дзень можна было не толькі знайсці сваю другую палову, але і з лёгкасцю адразу "ўзаконіць" свае адносіны і справіць вяселле.

Жарты, гульні, песні ля вогнішча стварылі незабыўную атмасферу свята і цудоўны настрой (вось чаго сапраўды не хапае студэнтам!). Усе ўдзельнікі акцыі развіваліся з Вязынкай са шкадаваннем, што ўсё так хутка скончылася, і са спадзяваннем праз год абавязкова прыехаць ізноў, каб падзякаваць Купалу за яго бязмежны талент, за шчырую любоў да Народа і Радзімы.

Лілія БОНДАР

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

ЛАБАРАТОРЫЯ ТАЛЕНТАЎ І ПРЫСТАНАК ПРАКТЫКІ

Праспект Пераможцаў, 9. Невялікае памяшканне. У першым пакоі стаяць парты. У другім – камп'ютары і шмат іншай апаратуры. Трэці абсталяваны пад аматарскую студыю. І тры разы на тыдзень (як мінімум!) сюды спяшаюцца студэнты журфака БДУ і спецыяльнасці "Аператар тэлебачання" Беларускай акадэміі мастацтваў. Яны працуюць разам, вучацца працаваць разам. Адны – у кадры, другія – за кадрам. Але ўсе яны складаюць Эксперыментальнае моладзевае творчае тэлерадыёаб'яднанне (ЭМТТРА), якое было створана па даручэнні кіраўніка дзяржавы ў 2005 годзе.

У мінулым годзе на базе тэлерадыёаб'яднання рэгулярна рыхтаваліся відэасюжэты для праграмы "Благовест", якая выходзіць на тэлеканале "Лад". Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта журналістыкі, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы гэтых сюжэтаў, былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі ад Мітрапаліта Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. ЭМТТРА зняло і дакументальны фільм для Беларускага экзархата.

Студэнты-першакурснікі таксама не засталіся ў баку і зрабілі нямала сюжэтаў: пра Сафію Слуцкую, царкоўныя службы для глуханямых, посныя стравы і іншыя – усе яны выходзілі ў праграме "Благовест". І гледачы, і самі студэнты засталіся задаволеныя. Але што найкаштоўнейшае – дык гэта атрыманы досвед. Хоць і цяжка, але як прыемна самому пісаць сінопсіс, адстойваць сваё бачанне тэмы, выязджаць "на месца", выбіраць планы, стрымліваючы дрыжыкі ў каленках, гаварыць у аб'ектыў камеры. І спадзявацца, што цябе пабачаць усе!

Архімандрыт Алексій дзякуе дэкану журфака Сяргею Дубовіку.

Зусім нядаўна мы падвялі першыя вынікі нашай працы. На факультэце журналістыкі сабраліся прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, Беларускага экзархата, газеты "Царкоўнае слова", дэканата і старшыня ЭМТТРА Віктар Маючы. Водгукі прафесіяналаў былі рознымі, але ўсе прыйшлі да аднаго – такое супрацоўніцтва карыснае як для студэнтаў, так і для прадстаўнікоў СМІ.

Дэкан факультэта журналістыкі Сяргей Дубовік так ацаніў працу маладой змены: "Адна справа – вучыцца журналістыцы на лекцыях і семінарах, і зусім іншае – актыўна ўдзельнічаць у творчым працэсе. Менавіта для гэтага было створана ЭМТТРА. Галоўнае ў ім – творчасць. Кожны можа рэалізаваць свой план, напісаць сцэнарый з такім разлікам, што яго возьмуць на радыё ці тэлебачанне".

Яшчэ адзін станоўчы момант – гэта магчымасць студэнтам праходзіць вучэбную практыку на тэлеканале "Лад". Праграма "Благовест" – ідэальны прыклад супрацоўніцтва журналістаў і аператараў. Яны "прыціраюцца" адзін да аднаго замалада, і гэта дае свае вынікі. Куды прасцей працаваць спецыялісту-пачаткоўцу, калі ў яго за плячыма такая школа прафесіяналізму і школа жыцця.

Мы ідзём наперад, кожны дзень пераадольваючы тыя кіламетры творчага шляху, на якія іншым спатрэбяцца гады. І калі ты здольны ісці з намі ў нагу, мы чакаем цябе!

Марыя РЫБІНА,
Салман АДЫЛЬХАНАЎ

ЗНАЁМЦЕСЯ!

У нашым універсітэце паводле ініцыятывы студэнтаў факультэта міжнародных адносін з'явілася "Моладзевая ліга нацый". Мэта новай арганізацыі – аб'яднанне студэнтаў розных нацыянальнасцяў у межах альма-матэр.

ШКОЛА СЯБРОЎСТВА І ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦІ

Падчас дабрачыннай акцыі Моладзевай лігі нацый.

Гэтая ідэя атрымала грант на штогадовым агульнаўніверсітэцкім конкурсе студэнцкіх праектаў. У арганізацыю ўступілі беларускія студэнты з розных факультэтаў і замежныя грамадзяне, якія навучаюцца ў БДУ. Чальцы "Моладзевай лігі нацый" бралі ўдзел у многіх універсітэцкіх мерапрыемствах і праводзілі ўласныя, напрыклад: вандроўкі па гарадах Беларусі, экскурсіі ў музеі сталіцы, арганізаваныя для студэнтаў з Кітая, Нігерыі, Азербайджана, Турцыі, В'етнама і іншых краін, наведванне імі РГЦ "Сілічы", дзе можна было пакоўзацца на каньках. Замежныя студэнты сфарміравалі футбольную каманду, якая трэніруецца ў спартыўным комплексе "Буравеснік". Значнай падзеяй стала далучэнне да агульнарэспубліканскай добраахвотнай акцыі "Тыдзень лесу" па высадцы дрэваў у лясах Барысава. А 21 мая адбылося ўрачыстае адкрыццё алеі Дружбы, пасля чаго замежныя студэнты выступілі з канцэртам.

З 15 па 28 чэрвеня ў Лепельскім раёне ў пансіянаце "Лясныя азёры" будзе арганізаваны міжнародны шматпрофільны лагер, у праграму якога ўваходзяць цікавыя забаўляльныя мерапрыемствы і экскурсіі. Усіх, хто жадае стаць актыўным удзельнікам арганізацыі і паехаць у лагер, запрашаем у каб. 205 галоўнага корпуса БДУ.

Аліна НОВІК,
сацыяльны педагог па рабоце з замежнымі грамадзянамі

ДОБРАЯ СПРАВА

СВЯТА ДЗЯЦІНСТВА

Міжнародны дзень аховы дзяцей ва ўсім свеце адзначаюць паразнаму. Аднак галоўная задача стаіць аднолькавая – выклікаць найбольшую колькасць усмешак і станоўчых эмоцый у дзяцей. Менавіта з такой місіяй 31 мая адправілася ў вёску Гайна Лагойскага раёна кагорта студэнтаў БДУ разам з універсітэцкім ансамблем танца "Літарынка", а таксама з украінскімі гасцямі – ансамблем "Эдэльвейс" (г. Херсон).

Вяскоўцы, сярод якіх большасць – дзеці ды падлеткі, пачалі збірацца ля Дома культуры задоўга да прыезду творчых калектываў, і спадзяванні гайнаўцаў спраўдзіліся. На працягу некалькіх гадзін на сцэне змянялі адзін аднаго то беларускі, то ўкраінскі ансамблі з найлепшымі нумарамі са сваіх рэпертуараў. Час, здавалася, праляцеў, як імгненне. Гледачы мелі магчымасць не толькі пацешыцца спрытнымі танцамі, але і ацаніць разнастайныя касцюмы, у якіх красаваліся выступоўцы. Шоу настолькі спадабалася вяскоўцам, што яны некалькі разоў выклікалі юных талентаў на біс. Прыемна было бачыць залу, перапоўненую дзецьмі і дарослымі, якія таксама прыйшлі на свята.

Мерапрыемства ў в. Гайна арганізавалі намаганнямі пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ і ўпраўлення па справах культуры. Назіраючы за шчаслівымі дзіцячымі тварамі і ззяючымі вачыма, можна было з упэўненасцю сказаць, што свята дзяцінства ўдалося!

Дзмітрый БІЗУН

ВЫСТАВЫ

РАДАСЦЬ ТВОРЧАСЦІ

Дэкаратыўна-прыкладная выстава "Свет творчасці, свет захапленняў" дэманстравалася 15–30 мая ў фае рэктарата БДУ.

Гэтая штогадовая тэматычная выстава па традыцыі прымяркоўваецца да Дня сям'і. У яе экспазіцыю ўвайшлі працы, выкананыя студэнтамі, супрацоўнікамі універсітэта і іх дзецьмі: малюнкі, розныя вырабы, упрыгожанні, унікальныя калекцыі, кулінарныя стравы і іншыя экспанаты. Акрамя таго, быў прадстаўлены студэнцкі праект "Фотатэрапія", у аснове якога – зліццё музыкі і фатаграфіі ў выглядзе кліпа (кіраўнік – студэнт IV курса фізфака Сяргей Паўлаў).

Прадэманстраваныя вырабы выклікалі вялікую цікавасць у наведвальнікаў, па просьбе якіх выстава, запланаваная да 23 мая, была працягнута яшчэ на адзін тыдзень.

Арганізатары мерапрыемства – Саюз жанчын БДУ – узнагародзілі прызамі найлепшыя працы. Галоўным спонсарам выступіў фізічны факультэт БДУ. Дарэчы, яго студэнты дзякуючы ініцыятыве Валянціны Гурыновіч зрабілі асноўны творчы ўнёсак.

Андрэй ГАЎРОН

З УСМЕШКАЙ

У сярэдзіне іспыта стары прафесар пракашляўся і сціпла звярнуўся да аўдыторыі:

– Ці не будзе хто-небудзь, хто не перапісвае зараз тэкст з падручніка, такім ласкавым, каб даць мне гэтую кнігу на некалькі хвілін? Я адразу ж яе вярну.

***

Гаспадар хаты:

– Я не выпушчу вас з пакоя, які вы займаеце, пакуль не заплаціце за яго.

Студэнт:

– Шчыра дзякую! Нарэшце я надоўга забяспечаны жыллём.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

13 чэрвеня 2008 года
Падпісана да друку 11.06.2008 г.
Зак. 606. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Кампутарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by